■ На кантролі

# ЗАПЛАЦІ ПАДАТКІ І...

## ПАРУШАЛЬНІКАМ ЗАКАНАДАЎСТВА «СПАКОЙНА СПАЦЬ» НЕ ДАЗВОЛЯЦЬ

**Кіраўнікі прадпрыемстваў, якія плацяць сваім работнікам вельмі нізкую зарплату альбо маюць па ёй запазычанасць, прыцягваюцца да дэкларавання сваіх даходаў і маёмасці, паведаміла начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Гродзенскай вобласці Лідзія СЯМАШКА.**

### Прад'явіце дэкларацыю!

Гэтае дэкларыраванне, як правіла, тычыцца тых суб'ектаў гаспадарання, якія плацяць зарплату «ў канвертах» альбо наогул не адлюстроўваюць яе на рахунках бухгалтарскага ўліку. За такія парушэнні летась да адказнасці прыцягнулі больш чым 30 кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый.

Дэкларыраванне даходаў і маёмасці актыўна прымяняецца цяпер і ў барацьбе з так званым «шэрым» імпартам. У прыватнасці, ім займаюцца тыя, хто ўвозіць тавары з той жа Польшчы пад выглядам асабістай маёмасці. Сярод іх ёсць даволі забяспечаныя людзі — з добрымі дамамі, аўтамабілямі. Ніхто з гэтай катэгорыі людзей не адмаўляецца ад дзяржаўных сацыяльных паслуг і карыстаецца імі нароўні з законапаслухмянымі падаткаплацельшчыкамі. Але... не плаціць падаткі. А прадукцыя «для асабістага ўжытку» на самай справе потым ідзе на продаж, ствараючы канкурэнцыю добрасумленным прадпрымальнікам, якія маюць дакументы, што пацвярджаюць набыццё тавару, і ў поўным аб'еме разлічваюцца па падатках. Паводле інфармацыі Лідзіі Сямашкі, каля 90 чалавек, якія перасяклі мяжу больш за 100 разоў, прыцягнулі да дэкларавання даходаў і маёмасці і яны заплацілі падаходны падатак. Важна і тое, што хтосьці пасля гэтага, мажліва, вырашыў усё ж легалізаваць свой бізнес, зарэгістраваўся як індывідуальны прадпрымальнік.

У цэлым леташнія кантрольныя мерапрыемствы падатковых органаў Гродзеншчыны дазволілі вывесці з ценявога сектара эканомікі і накіраваць у бюджэт 272,7 мільярда рублёў. Па выніках праверак накладзены арышт на тавары (алкагольную і тытунёвую прадукцыю, нафтапрадукты, аўдыё- і відэатэхніку і інш.) і грашовыя сродкі на 35,2 мільярда рублёў. Судовымі і падатковымі органамі прад'яўлена штрафаў на 2,8 мільярда рублёў.

Не заўсёды, праўда, адказнасць нядобрасумленных падаткаплацельшчыкаў адэкватная ўчыненым парушэнням.

— Мы праверылі камерцыйную фірму, якая займаецца перавозкай пасажыраў з Гродна ў Беласток, і ўстанавілі ўтойванне выручкі на 250 мільёнаў рублёў. Аднак паколькі гэты суб'ект гаспадарання карыстаецца спрошчанай сістэмай падаткаабкладання, то сума даналічанага падатку склала ўсяго 10 мільёнаў рублёў. Увіце розніцу... Зразумела, што трэба рабіць наша заканадаўства больш жорсткім у дачыненні да такіх парушэнняў, — зазначае Лідзія Сямашка.

### Выйсці з «ценю»

Разам з тым, выяўленне і пакаранне парушальнікаў — гэта толькі частка справы. Другая, не менш важная задача — каб яны выходзілі з «ценю», становіліся на падатковы ўлік і акуратна разлічваліся з бюджэтам. З гэтай мэтай падатковыя інспекцыі актыўна скарыстоўваюць такую форму кантролю, як маніторынг, што дазваляе дамагчыся павелічэння падатковых плацяжоў без прымянення да суб'екта гаспадарання адміністрацыйных спагнанняў. Дзякуючы гэтай рабоце летась 598 юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў дадаткова заплацілі ў бюджэт 45,1 мільярда рублёў. Толькі ў Скідзелі Гродзенскага раёна пасля такой праверкі больш за 20 чалавек адразу ж зарэгістраваліся і сталі плаціць падаткі. Акрамя таго, амаль на чвэрць (на 2776 чалавек) стала больш падаткаплацельшчыкаў за здачу ўнаём жылых памяшканняў.

Калі жадання працаваць у легальным прававым полі ўсё ж няма (за мінулы год выяўлена каля 550 фактаў незарэгістраванай прадпрымальніцкай дзейнасці) і папярэджанне, што даецца пасля першага парушэння, выхаваўчага эфекту не дае, то трэба быць гатовым да жорсткіх санкцый. У чым ужо пераканаліся, напрыклад, гродзенскія таксісты-нелегалы. Прычым пакаранне не абмяжоўваецца вялікім штрафам. У 2013 годзе ў парушальнікаў эканамічны суд арыштаваў і вярнуў у даход дзяржавы 6 аўтамабіляў, на якіх рабіўся незаконны бізнес, летась — 4.

Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што з 2015 года заканадаўства яшчэ больш узмацняе кантроль за «нелегаламі». У прыватнасці, раней незаконнага таксіста маглі прыцягнуць да адказнасці толькі пасля так званай кантрольнай закупкі, даказаўшы факт перавозкі. Цяпер жа, калі на транспартным сродку ёсць адпаведныя наклейка альбо плафон, а перавозчык не зарэгістраваны — гэта ўжо парушэнне. Як і, дапусцім, інфармацыя незарэгістраванай асобы з рэкламай нейкіх работ ці паслуг. Цяпер падатковым інспектарам не трэба ўжо даказваць іх выкананне, бо калі ты размясціў такую аб'яву, то ўжо павінен плаціць падаткі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ЖЫЛЛЁ СА «ЗНАКАМ УЛАСНАСЦІ»

**Узрасла колькасць зваротаў грамадзян аб парушэннях пры прыватызацыі жылля. Пасля праверкі скаргаў высветлілася, што многія з іх былі абгрунтаванымі.**

— Колькасць адміністрацыйных скаргаў на рашэнні выканкамаў аб прыватызацыі жылля ўзрасла больш як у 6 разоў. І гэта, безумоўна, сведчыць пра арганізацыйныя недахопы ў гэтай дзейнасці, — пракаментавалі карэспандэнту «Звязды» ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці.

На Віцебшчыне за апошнія два гады прыватызавалі больш за 31 тысячу кватэр, пакояў. У кантрольным ведамстве канстатуюць, што выканкамамі не выконваўся месячны тэрмін разгляду заяў грамадзян аб прыватызацыі жылых памяшканняў у Наваполацку, Аршанскім, Лёзненскім, Глыбоцкім, Гарадоцкім, Полацкім і іншых раёнах. З памылкамі вызначалі плошчу такога жылля...

— У большасці раёнаў рашэнні аб прыватызацыі жылых памяшканняў прымаліся без неабходных дакументаў. Не прымаліся належныя меры па спагнанні пратэрмінаванай запазычанасці па выплаце чарговых узносаў за такое жыллё і скасаванні дагавораў куплі-продажу ў судовым парадку. Таксама не займаліся спагнаннем вызначанай дагаворамі пені за час пратэрмінoўкі выплаты чарговага ўнёску. А ўсё гэта цягне за сабой неабгрунтаваныя страты даходнай часткі бюджэту, — дадалі ў камітэце.

Кантралёры зрабілі выснову, што праца ацэначных камісій, створаных пры выканкамах, носіць фармальны характар. Фактычна іх абавязкі выконвае адзін спецыяліст арганізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Былі і такія «ацэншчыкі», якія не валодаюць неабходнымі ведамі. Дакладнасць кошту прыватызацыі жылых памяшканняў членамі камісій не аналізавалася.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На выніках кантрольных мерапрыемстваў вынесена 20 пратэстаў на рашэнні аб прыватызацыі жылля, старшыням выканкамаў накіравана 21 прадстаўленне, абвешчана афіцыйнае папярэджанне... Усяго за дапушчаныя парушэнні да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнулі каля 40 службовых асоб.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ На слыху

# НЕ ЗАКРЫЮЦЬ, АЛЕ ПРАВЕРАЦЬ

**Для двух беларускіх прадпрыемстваў — «Санта Брэмар» і «Інка-Фуд» — узмоцніцца лабараторны кантроль. Гэтае рашэнне было прынята пасля таго, як Мінсельгасхарч разгледзеў пытанне аб'ектыўнасці прэтэнзій Рассельгаснагляду да якасці іх прадукцыі.**

Раней Федэральная служба па ветэрынарным і фітасанітарным наглядзе Расіі выявіла ў слабасалёнай сёмзе лістэрыю (род бактэрый). Мінсельгасхарч Беларусі абяцаў правесці расследаванне гэтага факта. Пазней Рассельгаснагляд паведаміў пра выяўленне антыбіётыкаў тэтрацыклінавай групы пры маніторынгу прадукцыі «Інка-Фуд».

**Дырэктар дэпартамента ветэрынарнага і харчовага нагляду Мінсельгасхарча Васіль ПІВАВАР** растлумачыў, што рашэння аб закрыцці прадпрыемстваў няма. Яны будуць знаходзіцца ў рэжыме ўзмоцненага лабараторнага кантролю да моманту заканчэння расследавання і ліквідацыі ўсіх магчымых неадпаведнасцяў. Ён таксама ўдакладніў, што як мінімум 10 чарговых партый прадукцыі будуць знаходзіцца пад пільным наглядам спецыялістаў з тым паказчыкам, па якім выяўлены неадпаведнасці па якасці.

«Калі вынікі будуць адмоўнымі і нічога не выявяць, падаецца пакет дакументаў на разгляд камісіі па рэестры, якая перавядзе прадпрыемства з рэжыму ўзмоцненага лабараторнага кантролю ў рэжым без абмежаванняў», — адзначыў Васіль Півавар.

Нагадаем, што асноўнымі напрамкамі дзейнасці беларуска-германскага сумеснага прадпрыемства ТАА «Санта Брэмар» з'яўляюцца перапрацоўка рыбы і морапрадуктаў, аптовы і рознічны гандаль прадуктамі харчавання. Прадпрыемства вырабляе больш за 500 відаў прадукцыі і ажыццяўляе пастаўкі ў краіны СНД, Балтыі, на еўрапейскія і амерыканскія рынкі, Ізраіль, Ліван, Грузію, Новую Зеландыю. Замежнае прадпрыемства ТАА «Інка-Фуд» з'яўляецца адным з найбуйнейшых у Беларусі мясаперапрацоўчым заводам. Яго прадстаўніцтвы адкрыты ў Мінску, Гродне, Гомелі, Віцебску, а таксама ў Расіі і Украіне.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

# «ПРЫЗЯМЛЕННЕ» Ў ШЫПЯНАХ

## Калі на пасаду дырэктара пяць гадоў таму вылучалі 29-гадовага Віталя Казлова, у гэтым была пэўная доля рызыкі

**Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Шыпяны-АСК» Смалявіцкага раёна адметнае тым, што тут навука і практыка спалучаюцца канкрэтна і вынікова. «Шыпяны-АСК» — структурнае падраздзяленне навукова-практычнага Цэнтра па земляробстве Нацыянальнай акадэміі навук. Мае статус элітнай гаспадаркі.**



Фота Андрэя МАКСІМАВА.

На яе землях культывуюцца перспектыўныя высакаўраджайныя сарты збожжавых, зернебабовых, крупяных культур, аднагадовых і шматгадовых траў, рапсу з гучнымі і прыгожымі назвамі: азімая пшаніца «Сюіта», «Элегія», «Ода», ячмень «Пралеска», «Зарніца», яравая пшаніца «Ростань», «Васіліса»... Таму павышаная ўвага і патрабавальнасць да гаспадаркі і яе кіраўніка зразумелая. І, відаць, была пэўная рызыка, калі сюды амаль пяць гадоў назад на пасаду дырэктара вылучылі 29-гадовага Віталя Казлова. Так, за плячыма выпускніка Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта быў сямігадовы досвед адміністрацыйнай работы брыгадзірам, намеснікам і нават непрацяглы перыяд кіраўніком сельскай гаспадаркі. Але «Шыпяны-АСК» — асаблівае прадпрыемства. І кадравая памылка магла б дорага абысціся. Аднак выбар аказаўся правільным.

Новы дырэктар і кадры на ключавыя пасады падбіраў адпаведныя: маладых, адукаваных, энергічных, амбіцыёзных. Галоўны заатэхнік Вадзім Касцяневіч — равеснік Казлова. Галоўнаму інжынеру Андрэю Малчанаву — 26, галоўнаму аграному Генадзю Шэршню — 27. На іх фоне ветэранамі выглядаць 31-гадовы галоўны ветэрынарны ўрач Сяргей Роўкадзь і 36-гадовы галоўны эканаміст Андрэй Панамарэнка. Пераважная большасць спецыялістаў сярэдняга звяна — ва ўзросце да 35 гадоў. А сярэдні ўзрост калектыву — крыху больш за 40. Амаль класічная суадносіны сталых і маладых кадраў. Можна без перабольшвання казаць, што «Шыпяны-АСК» — гаспадарка маладзёжная і паспяховая. Напрыклад, Генадзю Шэршню летась удалося дасягнуць сярэдняй ураджайнасці збожжавых 70 цэнтнераў з гектара.

Натуральна, у Год моладзі ў краіне мы не маглі не закрануць самае хвалюючае для маладых сем'яў пытанне: кватэрнае. Ці псуе яно характары працаўнікоў «Шыпяны-АСК»? Аказваецца, зусім не. Наадварот, з'яўляецца адным з тых трывалых якараў, якія надзейна затрымліваюць маладых людзей у гаспадарцы. Многія з іх пасяліліся на вуліцы Маладзёжнай у аграгарадку Алесіна, дарэчы, адным з лепшых у Смалявіцкім раёне па ўзроўні добраўпарадкавання і забеспячэння сацыяльнымі стандартамі. Штогод у гаспадарцы ўзводзіцца 10 дамоў сядзібнага тыпу з усімі выгодамі. У новых дамы засяляюцца маладыя спецыялісты, якія маюць патрэбу ў даху над галавой. Фактычна чаргі на жыллё ўжо няма, калі не лічыць тых, хто стаіць на пашырэнне. Сёлета чарговая «дзясятка» будуецца на перспектыву для будучых кадраў жывёлагадоўлі. Важнай падзеяй у Алесіна стала і адкрыццё царквы, пабудаванай на ахвяраванні мясцовага насельніцтва.

Вынікамі мінулага года дырэктар у цэлым задаволены. Усе асноўныя мэты ў земляробстве і жывёлагадоўлі дасягнуты, пастаўленыя летась задачы выкананы, а па асобных паказчыках перавыкананы. Азімай пшаніцы сабралі каля 80 цэнтнераў з гектара. Віталь Казлоў агучыў самыя значныя лічбы. Сярод іх хочацца адзначыць адзін з двух галоўных эканамічных паказчыкаў, па якіх мяркуюць увогуле аб эфектыўнасці развіцця любога прадпрыемства — гэта выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў і паслуг у разліку на аднаго працоўнага. Дык вось, летась у «Шыпяны-АСК» яна склала 485 мільёнаў рублёў. Дарэчы, лепшы ў раёне паказчык. І што ўражвае: за мінулы год у доларавым эквіваленце выручка на сярэднестатыстычнага работніка ў «Шыпяны-АСК» узрасла прыкладна на 12–13 тысяч долараў у эквіваленце.

**Штогод у гаспадарцы ўзводзіцца 10 дамоў сядзібнага тыпу з усімі выгодамі. У новае жыллё засяляюцца маладыя спецыялісты, якія маюць патрэбу ў даху над галавой.**

Казлоў — прадстаўнік новага пакалення кіраўнікоў аграпрамысловага комплексу краіны. Ён прагматык, эканаміст, як той казаў, да мозгу касцей, імкнецца пралічыць прыблізныя вынікі гаспадарання на бліжэйшую і сярэднетэрміновую перспектыву, што сёння зусім няпроста. Пастаянна думае над тым, як захаваць станоўчую дынаміку развіцця, якія ўкараняць інавацыйныя метады ў эканоміку гаспадаркі, як не даць кадрам супакоіцца цяперашнімі здабыткамі. Вось аб чым сёння баліць галава, прызнаецца дырэктар.

Сярэдняя зарплата, напрыклад, галоўных спецыялістаў складае тут да 11 мільёнаў штомесяц, ёсць у іх службовы транспарт, усе забяспечаны жыллём, мабільнай сувяззю. Акрамя таго, ёсць магчымасць праявіць сябе, а значыць, і перспектыва кар'ернага росту. Але галоўнае для ўсіх — эканоміка. Асноўны напрамак дзейнасці — мяса-малочная вытворчасць з развітым раслінаводствам. Надзейны прыбытак дае пабудаваны некалькі гадоў назад, адзіны ў краіне насенны завод, дзе ўкаранены інавацыйныя тэхналогіі сушкі і дапрацоўкі збожжа. Але трэба ісці далей, развіваць тое, што дае эканамічную выгаду, надзейны прыбытак.

**Леанід ТУГАРЫН.**

*Смалявіцкі раён.*